Таццяна КУЗЬМІНІЧ

# Лічбавая рэканструкцыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя

*Нацыянальная бібліятэка Беларусі надае асаблівую ўвагу збору і захоўванню фонду нацыянальных дакументаў, неад'емнай часткі фіксаванай гістарычнай памяці нашага грамадства. У выніку розных гістарычных падзей многія з падобных дакументаў не захаваліся, іншыя зберагаюцца па-за тэрыторыяй Беларусі. Нацыянальная бібліятэка Беларусі працуе над выяўленнем і дакамплектаваннем сваіх фондаў як аўтэнтычнымі экзэмплярамі дакументаў, так і іх лічбавымі копіямі.*

Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) рэалізуе комплекс мерапрыемстваў па бібліяграфічным мадэляванні нацыянальнай дакументнай спадчыны Беларусі, што захоўваецца ў буйнейшых бібліятэках краіны і за мяжой, а таксама па стварэнні, запазычванні лічбавых копій асобных дакументаў. НББ здзяйсняе планавую алічбоўку дакументаў, што захоўваюцца ў яе фондзе, запазычванне або абмен лічбавымі копіямі з іншымі арганізацыямі. Гэтыя і некаторыя іншыя мерапрыемствы дазваляюць сабраць у электронным выглядзе больш поўную калекцыю нацыянальных дакументаў у параўнанні з наяўнасцю аўтэнтычных экзэмпляраў.

Распрацоўваюцца асобныя тэматычныя праекты, у межах якіх здзяйсняецца не толькі збор усіх лічбавых копій пэўнага блоку нацыянальных дакументаў, але і ствараецца розная дадатковая інфармацыя: хронікі падзей і апісанні персаналій, бібліяграфічныя спісы і агляды, падбіраюцца пры неабходнасці музычныя кампазіцыі, фотаздымкі, карціны, плакаты, паштоўкі, іншыя матэрыялы. Такі падыход дазваляе распрацаваць тэму шматпланава, сфарміраваць для даследчыкаў якасную крыніцазнаўчую базу і, што немалаважна, падаць гэта ў кантэксце эпохі, перадаць яе атмасферу.

Такая карпатлівая і навукаёмістая работа прадугледжвае вывучэнне гістарычных падзей, заканамернасцяў развіцця навукі і адукацыі, сістэмы сацыяльных і канфесійных адносін, дзейнасці бібліятэк і архіваў. Яе поспех у многім залежыць ад выпрацоўкі аптымальных алгарытмаў пошуку, умення наладжваць і падтрымліваць плённыя прафесійныя кантакты, ступені адкрытасці і салідарнасці бібліятэчнага грамадства розных краін, імкнення аб'ядноўваць намаганні супрацоўнікаў бібліятэк розных узроўняў і ведамаснага падпарадкавання, а таксама прыцягнення да сваіх бібліятэчных вышукаў шырокіх колаў навукова-га грамадства, архівістаў, краязнаўцаў.

З 2015 г. НББ разам з кафедрай крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ, Віцебскай абласной бібліятэкай, бібліятэкай і музеем Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі і іншымі бібліятэчнымі, архіўнымі і музейнымі ўстановамі распрацоўвае навукова-даследчую тэму "Віртуальная рэканструкцыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі".

Асноўнымі задачамі гэтага праекта з'яўляюцца даследаванні дакументаў і матэрыялаў па асобных аб'ектах рэгіянальнай гісторыі Беларусі сярэдзіны XIX — пачатку XX ст., лічбавае ўзнаўленне аўтэнтычных крыніц і вынікаў іх навуковага асэнсавання, аб'яднанне ў адным рэсурсе бібліяграфічнай, фактаграфічнай, тэкставай, графічнай інфармацыі пра пэўны рэгіён, установу, арганізацыю і прадстаўленне яе шырокай аўдыторыі карыстальнікаў.

Выбар перыяду не выпадковы. Сярэдзіна XIX — пачатак XX ст. — даволі супярэчлівы час для развіцця дакументнай сферы на беларускіх землях. З аднаго боку, яе не маглі не закрануць агульнаеўрапейскія тэндэнцыі фарміравання новых эканамічных адносін і развіцця прамысловасці, што значна паўплывала на характар інфармацыйных патрэб і інфармацыйнае забеспячэнне розных сфер практыкі, навукі і адукацыі. Сродкі фіксавання інфармацыі, апрабаваныя на папярэдніх гістарычных этапах, набылі масавае распаўсюджанне. Сталі стварацца якасна новыя формы перадачы інфармацыі, якія давалі найбольш шырокія магчымасці для вывучэння рэчаіснасці і прадстаўлення навуковых ведаў. З другога боку, для беларускіх зямель гэта даволі цяжкі перыяд, што было звязана перш за ўсё з неспрыяльнымі наступствамі падаўлення паўстанняў 1830—1831 і 1863—1864 гг. Уплыў эканамічнага ўздыму апошняй чвэрці XIX ст. не быў такім прадуктыўным для развіцця нацыянальнай мовы, навукі, адукацыі, бібліятэчнай, архіўнай і выдавецкай справы, якім мог быць у іншых сацыяльна-палітычных умовах. Разам з тым на самых розных узроўнях рабіліся захады па арганізацыі збору і вывучэння матэрыялаў, якія тычыліся беларускіх зямель, ствараліся розныя архіўныя і навуковыя структуры,




выяўляліся і публікаваліся гістарычныя дакументы, праводзіліся розныя краязнаўчыя даследаванні. Актывізавалася кнігавыданне і выпуск перыядычнага друку. Усё гэта спрыяла не толькі рэалізацыі намераў розных колаў даследчыкаў таго часу, але і фарміраванню добрай крыніцазнаўчай базы для сучасных гісторыкаў.

Аднак падзеі першай паловы XX ст. (рэвалюцыі, Першая сусветная і Грамадзянская войны, замежная інтэрвенцыя на тэрыторыі Беларусі, розныя формы дзяржаўных утварэнняў з адчужэннямі часткі беларускіх зямель, Другая сусветная вайна з акупацыяй усёй тэрыторыі Беларусі і інш.) аказалі надзвычай негатыўны ўплыў на захаванасць дакументаў і матэрыялаў, якія знаходзіліся ў беларускіх бібліятэках і архівах. Многія з іх былі страчаныя, беларускія або ідэнтычныя ім экземпляры часта ў большай ступені прадстаўленыя ў фондасховішчах другіх краін свету, чым у айчынных. Разам з тым яны неабходныя беларускім вучоным і краязнаўцам. Таму іх знаходжанне і "лічбавы зварот" разглядаюцца ў якасці адной з важных задач НББ як галоўнай бібліятэчнай установы краіны, у фондах якой захоўваецца самая буйная ў свеце калекцыя беларускіх дакументаў (створаных на тэрыторыі Беларусі, на беларускай мове, беларускімі аўтарамі, пра Беларусь), таксама як і фарміраванне бібліяграфічных і фактаграфічных ведаў пра нацыянальных аўтараў, тэксты і інш.

У рамках рэалізацыі праекта "Віртуальная рэканструкцыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі" былі выпушчаны мультымедыйныя выданні, прысвечаныя гісторыі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі (БДСГА)[1], беларускім рэгіёнам у дакументах і матэрыялах Віленскай археаграфічнай камісіі[2], а таксама дзейнасці Віцебскай вучонай архіўнай камісіі[3]. Паралельна вядзецца распрацоўка іншых тэм (напрыклад, 1000-годдзе Брэста), вывучаецца магчымасць правядзення новых даследаванняў у галіне рэгіянальнай гісторыі.

Выпушчаныя дыскі дазволілі комплексна прадставіць гістарычную нарматыўную прававую базу па розных рэгіёнах Беларусі і ўсебакова даследаваць дакументны паток па вельмі цікавых для айчыннай гісторыі аб'ектах — старэйшай вышэйшай навучальнай установе сельскагаспадарчага профілю і навуковым таварыстве. Для гэтых выданняў былі спецыяльна напісаны (іншы раз выкарыстаны апублікаваныя раней) навуковыя артыкулы, нарысы, розныя даведачныя матэрыялы, якія асвятлялі асноўныя этапы гісторыі навучальнай установы (БДСГА), стварэнне і этапнасць развіцця Віленскай археаграфічнай камісіі, Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, а таксама асобныя аспекты іх дзейнасці. Сабраны і абагульнены вялікі фактаграфічны матэрыял. Яго склад і форма прадстаўлення, як правіла, вар'іруюцца ў залежнасці ад аб'ёму. Так, пры стварэнні дыска, прысвечанага БДСГА, на аснове вывучэння дакументаў і матэрыялаў былі распрацаваныя схемы, у якіх адлюстравана ведамасная падпарадкаванасць, структура, рэарганізацыі і перайменаванні гэтай навучальнай установы ў розныя храналагічныя перыяды. Геаграфічныя аб'екты ў Актах Віленскай археаграфічнай камісіі ўзноўлены як у іх гістарычным варыянце, так і прадстаўлены ў кантэксце сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Рэспублікі Беларусь з улікам цяперашніх тапонімаў на беларускай і рускай мовах. Для прадстаўлення дзейнасці Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (ВВАК) падалося неабходным складанне матэрыялаў хранікальнага характару. Камісія была створана ў 1909 г. (у адпаведнасці з зацверджаным 13 красавіка 1884 г. Палажэннем аб губернскіх гістарычных архівах і вучоных архіўных камісіях) для аховы помнікаў гісторыі і культуры, што знаходзіліся на тэрыторыі губерні, збору прадметаў даўніны, даследавання і папулярызацыі гісторыі роднага краю, а таксама падрыхтоўкі і выдання навуковых прац, апісанняў архіваў, каталогаў бібліятэк, музеяў і г. д. Яна праіснавала толькі 10 гадоў[4]. Вельмі важна было паказаць этапнасць яе дзейнасці, а таксама ўплыў на яе ваенных і рэвалюцыйных падзей.

Значная ўвага пры распрацоўцы праектаў надавалася персаналіям. Імкненне шматпланава паказаць гісторыю БДСГА, вынікі дзейнасці Віленскай археаграфічнай камісіі, ВВАК патрабавала выяўлення і ўважлівай апрацоўкі спіса асоб, звязаных з імі, а таксама ўстаноў, дзяржаўных структур, што паўплывалі на іх стварэнне і развіццё на розных гістарычных этапах.

Так, у БДСГА працавалі многія сусветна вядомыя вучоныя, праводзіліся навуковыя даследаванні, вы-




чылася шмат вядомых пазней асоб. Яна аказвалася ў эпіцэнтры рэвалюцыйных, ваенных, грамадска-палітычных падзей. Тут ішло актыўнае сацыякультурнае і літаратурнае жыццё. У сувязі з дзейнасцю земляробчага інстытута ўспамінаюцца імёны Івана Тургенева, Тараса Шаўчэнкі, Максіма Горкага, Якуба Коласа, Янкі Купалы, у акадэміі некаторы час працавалі Юрка Гаўрук, Максім Гарэцкі, Паўліна Мядзёлка. У 1920-я гг. на базе гэтай навучальнай установы была разгорнута маштабная краязнаўчая і навуковая работа па вывучэнні Беларусі. Таму раздзел дыска, прысвечаны прафесарска-выкладчыцкаму складу і іншым значным асобам у гісторыі навучальнай установы, атрымаўся даволі істотным. Гэта тэкставыя біяграфічныя даведкі аб персонах і бібліяграфічная інфармацыя (асноўныя працы, створаныя гэтымі асобамі, і літаратура пра іх). Прыводзіцца таксама спіс кіраўнікоў горацкай сельскагаспадарчай навучальнай установы ў розныя гады, графічныя вобразы асобных старонак памятных кніжак Магілёўскай губерні і іншых выданняў, у якіх змешчаны звесткі аб персанальным складзе яе супрацоўнікаў, спіскі выпускнікоў і г. д.

Біяграфічныя артыкулы — неаднародныя па аб'ёме інфармацыі: ад пераліку толькі асноўных звестак да разгорнутых даведак. Гэта залежала як ад "маштабнасці" асобы, так і ад наяўнасці звестак аб ёй. У біяграфічных і бібліяграфічных матэрыялах персанальнага характару мы імкнуліся акцэнтаваць увагу толькі на тых, якія адлюстроўваюць "горацкі" перыяд жыцця таго ці іншага даследчыка. Такі ж падыход быў рэалізаваны і пры прадастаўленні інфармацыі персанальнага характару для дыска, прысвечанага Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, якая мела праўленне, савет, бібліятэку, гістарычны архіў і музей з калекцыямі манет і іншых экспанатаў. Пры ёй дзейнічала асобная камісія для разгляду архіўных спраў у розных установах. Незадоўга да 100-гадовага юбілею вайны 1812 г. быў створаны спецыяльны камітэт па ўвекавечанні памяці яе герояў, пошуку брацкіх магілак, устанаўленні помнікаў. Па ініцыятыве Віцебскай вучонай архіўнай камісіі ў 1910 г. быў адкрыты Віцебскі настаўніцкі інстытут, у 1911 г. — Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. Выдаваліся працы па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, археалогіі Віцебшчыны, перыядычны зборнік "Труды Витебской ученой архивной комиссии" (кн. 1 выдадзена ў Віцебску ў 1910 г.), "Полоцко-Витебская старина" (выйшлі 3 выпускі ў перыяд 1911—1916 гг.).

Віцебская вучоная архіўная камісія падтрымлівала сувязі з больш чым 100 навуковымі арганізацыямі Расіі і замежжа. У 1910 г. у склад камісіі ўваходзіла 28 членаў-заснавальнікаў, 99 ганаровых, 325 сапраўдных членаў і 15 членаў-супрацоўнікаў. Сярод іх: Я.Ф.Карскі, Д.Н.Кайгародаў, В.В.Ключэўскі, А.А.Шахматаў, Д.І.Даўгяла, Б.І.Эпімах-Шыпіла, П.П.Сямёнаў-Цян-Шаньскі (ганаровыя члены), К.І.Ціхаміраў, У.К.Стукаліч, І.І.Далгоў, С.П.Сахараў, К.А.Змігродскі, М.Я.Нікіфароўскі і іншыя вядомыя вучоныя, краязнаўцы, грамадскія дзеячы. Старшынямі камісіі ў розныя гады былі В.С.Арсеньеў, В.А.Кадыгробаў і К.І.Ціхаміраў. Прадастаўленне персанальнай інфармацыі пра гэтых людзей патрабавала як значнай пошукавай работы, так і яе сур'ёзнай аналітычнай перапрацоўкі і выкладання фактаў у кантэксце дзейнасці камісіі.

Персанальны блок інфармацыйнага масіву дыска, прысвечанага Віленскай археаграфічнай камісіі, значна меншы ў параўнанні з вышэйразгледжанымі выданнямі і рэальным пералікам асоб, датычных да дзейнасці камісіі, улічваючы яе паўвекавую гісторыю, а таксама складаную структуру. Гэта было абумоўлена тым, што асноўнай задачай праекта было прадастаўленне вынікаў публікацыйнай работы камісіі, крыніц, звязаных з асобнымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі Беларусі ў розныя гістарычныя перыяды.

Для ўсіх праектаў характэрна старанная прапрацоўка дакументнага патоку, створанага як у выніку дзейнасці ўстаноў, камісій, асоб, так і іх гістарычнага асэнсавання. Напрыклад, для выдання, прысвечанага Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, зроблены паўнавартасны бібліяграфічны паказальнік, які ўключыў пералік выданняў камісіі, публікацыі членаў і іншыя матэрыялы аб дзейнасці ВВАК. Прычым у ім рэалізаваны не толькі метаінфармацыйны ўзровень прадстаўлення інфармацыі, але і даюцца спасылкі на тэксты саміх публікацый (у тым выпадку, калі яны з'яўляюцца

ў цяперашні час грамадскім набыткам, або ад аўтараў атрымана згода на выкарыстанне лічбавай копіі, або ў рэжыме цытавання).

Прыкладна такі ж падыход рэалізаваны і ў выданнях, прысвечаных гісторыі БДСГА і дакументам Віленскай археаграфічнай камісіі. Для першага з іх складзены бібліяграфічны паказальнік дакументаў і матэрыялаў па гісторыі БДСГА (каля 750 бібліяграфічных запісаў), які ўключае як рэтраспектыўны дакументны паток, так і звесткі аб сучасных публікацыях. У асобны блок вылучана бібліяграфічная і паўнатэкставая інфармацыя аб афіцыйных і нарматыўных рэгламентуючых дакументах. На другім дыску прадстаўлены алічбаваны "Подробный каталог изданий Виленской комиссии для разбора древних актов, Виленского центрального архива, бывшего Витебского центрального архива, Виленской публичной библиотеки и Виленского учебного округа, вышедших в свет с 1865 по 1905 год", а таксама складзены пералік іншых прац, якія былі па-за межамі каталога. Прадстаўлена таксама бібліяграфічная інфармацыя пра артыкулы сучаснікаў, якія апісвалі выданні камісіі і яе дзейнасць у цэлым, а таксама пра айчынныя і замежныя публікацыі іншых аўтараў, пачынаючы з 1957 г. і па 2015 г. Такі падыход дазваляе паказаць даволі сур'ёзную крыніцазнаўчую базу для вывучэння дзейнасці названай камісіі і садзейнічае яе фарміраванню ў адносінах да іншых блізкіх тэм, персаналій, аб'ектаў.




Самыя значныя аб'ёмы інфармацыі, што прадстаўлена на дысках, займаюць графічныя вобразы дакументаў, створаных у сярэдзіне XIX — пачатку XX ст. Гэта лічбавыя копіі 39 тамоў актаў, якія былі надрукаваныя Віленскай археаграфічнай камісіяй, прац ВВАК, запісак і зборнікаў навуковых прац, матэрыялаў навуковых таварыстваў і доследных установаў БДСГА за адпаведны перыяд. На першы погляд, гэтыя блокі інфармацыі не маюць ярка акрэсленага навуковага складальніка. Аднак лічбаваму ўзнаўленню аўтэнтычных тэкстаў папярэднічала вялікая работа па падрыхтоўцы іх пералікаў, пошуку выданняў у розных фондасховішчах, выяўленні архіўных і музейных дакументаў, структураванні атрыманых масіваў і прадстаўленні ў зручнай для карыстальнікаў форме. Гэта значна спрашчае работу даследчыкаў па пошуку і аналізу неабходных тэкстаў, дазваляе працаваць з імі ў любы, не абмежаваны ніякімі інстытуцыйнымі рамкамі час. Акрамя таго, гэта вельмі важна для аднаўлення і захоўвання беларускай дакументнай спадчыны. Дакументы, якія маюць непасрэднае дачыненне да Беларусі (створаныя ці тыя, што захоўваліся на яе тэрыторыі), у цяперашні час могуць знаходзіцца ў бібліятэчных, музейных, архіўных і прыватных калекцыях розных краін. Зварот аўтэнтычных выданняў і рукапісаў часцей за ўсё немагчымы. Таму стварэнне электронных копій дазваляе ўзнавіць страчаныя экзэмпляры і віртуальна рэканструяваць нацыянальную дакументную спадчыну.

Асабліва ярка гэта праявілася пры падрыхтоўцы дыскаў, прысвечаных выданням памятных кніжак, якія выходзілі ў свой час у розных губернях Расійскай Імперыі. У пачатку 2014 г. НББ завяршыла выпуск серыі "Памятныя кніжкі беларускіх губерній"[5] — пяць мультымедыйных дыскаў, прысвечаных гістарычным крыніцам фактаграфічнага характару, якія выходзілі на беларускіх землях з сярэдзіны XIX ст. да сярэдзіны 1910-х гг. і ўтрымлівалі звесткі пра розныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі, установы і інш. У бібліятэках, архівах і музеях Беларусі збор арыгіналаў выданняў далёка не поўны: найбольш шырока прадстаўлены масіў толькі па Віцебскай губерні (прыкладна 80% ад агульнай колькасці выпускаў), па другіх — значна менш. Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ўдалося стварыць лічбавыя калекцыі поўных камплектаў усіх памятных кніжак, якія тычацца беларускіх тэрыторый. Гэты лічбавы масіў быў пакладзены ў аснову электронных выданняў, дзе апрача графічных вобразаў выданняў даюцца гістарычныя даведкі і навуковыя публікацыі па тэме, карты, планы, гербы, партрэты, паштоўкі, малюнкі з відамі гарадоў і помнікаў архітэктуры, а таксама фрагменты музычных твораў беларускіх кампазітараў таго перыяду.

Выданні былі высока ацэненыя гісторыкамі і краязнаўцамі. Паспяхова рэалізаваныя падыходы пры распрацоўцы гэтых праектаў пакладзены ў аснову шэрагу персанальных дыскаў, у тым ліку і самага аб'ёмнага, прысвечанага спадчыне Ю.І.Крашэўскага[6], а таксама разгледжанай намі навукова-прыкладной тэме "Віртуальная рэканструк-

цыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі". На яго могуць быць арыентаваны і іншыя праекты, звязаныя, напрыклад, з навуковымі выданнямі першай паловы XIX ст., дзейнасцю Полацкага езуіцкага калегіума і іншых навучальных устаноў на беларускіх землях, выпускамі губернскіх ведамасцяў, а таксама з буйнымі гістарычнымі датамі беларускіх гарадоў і іншых населеных пунктаў, беларускімі магнацкімі і шляхецкімі родамі і інш.

Такім чынам, прадстаўлены вопыт лічбавай рэканструкцыі дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі садзейнічае збору і захаванню нацыянальнай культурнай спадчыны, актуалізацыі гістарычнай інфармацыі. Значнасць распрацоўкі падобных тэм не толькі ў стварэнні крыніцазнаўчай базы для даследчыкаў і гістарычнай панарамы падзей, але і ў магчымасці папаўнення кантэнту электроннай бібліятэкі НББ (у перспектыве — асноўнага масіву Нацыянальнай электроннай бібліятэкі) лічбавымі копіямі тых дакументаў, якіх няма на тэрыторыі Беларусі або якія захоўваюцца ў прыватных калекцыях, у фондах сацыяльных інстытутаў, менш даступных для шырокага кола карыстальнікаў. Гэта магчымасць выяўлення і стварэння вялікіх масіваў фактаграфічнай інфармацыі як для саміх праектаў, так і для папаўнення Нацыянальнай базы даных аўтарытэтных запісаў, фактаграфічных баз даных "Беларусь у асобах і падзеях" і "Вучоныя Беларусі", глыбокай бібліяграфічнай прапрацоўкі асобных тэм і папаўнення электроннага інфармацыйнага рэсурсу "Нацыянальная бібліяграфія Беларусі". І, бадай, адно з самых галоўных дасягненняў рэалізацыі вышэйразгледжанага і іншых магчымых праектаў — устанаўленне ўзаемавыгадных прафесійных кантактаў і практыкай падмацаваная магчымасць кансалідацыі бібліятэчнага грамадства розных краін, аб'яднанне намаганняў бібліятэкараў, архівістаў, вучоных, педагогаў, а таксама годнае прадстаўленне бібліятэчных электронных выданняў у радзе навуковай дакументнай прадукцыі краіны.

---

[1] 100 год з гісторыі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі: дакументы і матэрыялы 1840—1940 гг. (да 175-годдзя з дня адкрыцця): мультымедыйнае электроннае выданне. — Мінск: НББ, 2015. — 1 электроны аптычны дыск (DVD-ROM).

[2] Региональная история Беларуси в документах и материалах Виленской археографической комиссии (1864—1915) [Электронный ресурс]; авторы-составители: А.В.Ганчарова [и др.]; под научной редакцией Т.В.Кузьминич. — Минск: Национальная библиотека Беларуси, 2017. — 1 электронный оптический диск (DVD-R): цв.; 12 см; в контейнере, 19х14 см.

[3] Деятельность Витебской ученой архивной комиссии (1909—1919): документы и материалы [Электронный ресурс] / авторы-составители: Т.В.Кузьминич [и др.]; под научной редакцией Т.В.Кузьминич. Минск: Национальная библиотека Беларуси, 2017. — 1 электронный оптический диск (DVD-R): цв.; 12 см; в контейнере, 19х14 см.

[4] Віцебская вучоная архіўная камісія была ліквідавана ў сувязі з утварэннем Віцебскага губернскага архіўнага ўпраўлення ў 1919 г., бібліятэка, архіў і музей былі передадзеныя Віцебскаму аддзяленню Маскоўскага археалагічнага інстытута.

[5] Памятные книжки Витебской губернии (1861—1914) [Электронный ресурс] / сост.: И.В.Грядовкина, В.П.Лапо; под науч. ред. Т.В.Кузьминич. Минск: Нац. б-ка Беларуси, 2011. — 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM); Памятные книжки Минской губернии (1845—1916) [Электронный ресурс] / сост.: И.В.Грядовкина, В.П.Лапо; под науч. ред. Т.В.Кузьминич. Минск: Нац. б-ка Беларуси, 2011. — 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM); Памятные книжки Могилевской губернии (1853—1916) [Электронный ресурс] / сост.: В.П.Лапо, Н.С.Шилович; под науч. ред. Т.В.Кузьминич. Минск: Нац. б-ка Беларуси, 2011. — 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM); Памятные книжки Гродненской губернии (1847—1915) [Электронный ресурс] / сост. Т.В.Дробышевская; под науч. ред. Т.В.Кузьминич. Минск: Нац. б-ка Беларуси, 2013. — 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM); Памятные книжки Виленской губернии (1845—1915) [Электронный ресурс] / сост. И.В.Грядовкина; под науч. ред. Т.В.Кузьминич. Минск: Нац. б-ка Беларуси, 2014. — 1 электрон. опт. диск (DVD-ROM).

[6] Юзаф Ігнацый Крашэўскі (1812—1887) [Электронны рэсурс] = Józef Ignacy Kraszewski = Юзеф Ігнацій Крашевській = Юзеф Игнаций Крашевский: інфарм. электрон. выд. на 2 DVD-дысках / склад.: Л.В.Гарбачова, А.М.Мяснянкіна ; пад навук. рэд. Т.В.Кузьмініч. Мінск: Нац. б-ка Беларусі, 2013. — 2 электрон. апт. дыскі (DVD-ROM).

**Таццяна Васільеўна Кузьмініч,** *намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па інфармацыйных рэсурсах, канд. пед. навук, дацэнт*